## УЗАЕМААДНОСІНЫ ПАМІЖ ВУЧОНЫМІ ЯК ПРАЯВА КУЛЬТУРЫ (ПАВОДЛЕ АДНАГО ПРАТАКОЛА*)

Перамога Кастрычніцкай рэвалюцыі прынесла с сабой не толькі сутнас эканомікі і грамадска-палітычным жыцці. Яна абумовіла з'яўленне новых прафесійнай навуковай этыкі, а ў беларускіх умовах значную ролю тут адыг нацыянальны момант. Адпаведна тагачасных палітычных падыходаў, кіруючь рэспублікі быў узяты курс на падзел інтэлігенцыі. Імкненне да гэтага з боку камп прадэманстравана ў 1925 г. у дакладзе сакратара ЦК КП(б)Б А. Крыніцкага (лістапа канферэнцыі камуністычнага студэнцтва і выкладчыкаў ВНУ і рабфакаў. Тут публічн негатыўнае стаўленне да гэтак званага нацыянал-дэмакратызму. А. Крыніц інтэлігенцыю на тры групы ў адпаведнасці з падзелам сялянства: бядняк – "наша ін серадняк – "якая хістаецца", кулак – "нацдэмаўская". У адначасовай фармулёўць апошняя група акрэслена больш выразна: "Актыўна варожая нашай паліт замаскаваная частка паказною савецкаю лёяльнасцю, прадстаўляе нацыянал-дэмакратызм

Зыходзячы з пасылак А. Крыніцкага, лагічна рабіліся высновы аб асноўны нацыянал-дэмакратычнай ідэалогіі: адмаўленне дыктатуры пралетарыяту, і палітычнага ўраўнавання сялянства з рабочым класам і да так званай агульнасялян стаўка на кулацкія элементы сяла, імкненне да ўплыву на дзяржаўны апарат з мэт сацыяльнай сутнасці, праведзенне беларускага шавінізму і наступальная лінія ў д нацыянальных меншасцяў [1, арк. 23].

Да згаданага дадаецца яшчэ супрацьстаянне паміж самімі беларусамі – " "усходнікамі" па вызначэнні АДПУ. Гэтую выснову можна праілюстраваць на прыкла з філолагам В. Воўк-Левановічам (скончыў Петраградскі універсітэт у 1923 г., давуч войнаў і рэвалюцый), які меў месца ў БДУ, калі Галоўпрафадукацыя ў кастры прапанавала праўленню універсітэта не пачынаць асістэнту самастойнага вык рашэння пытання аб адкліканні яго з боку ІБК. Тое, што здарылася тады заслуг ляколькі дазваляе ўбачыць канкрэтную сітуацыю ўнутры навуковай супольнасці ў уплыў на яе з боку асобных дзяржаўных інстытуцый, і таму, што калізія, якая праяв выпадку, не знайшла вырашэння ў наступныя гады.

30 студзеня 1924 г., прайшоўшы ўсе выбарчыя інстанцыі і атрымаўшы пасад В. Воўк-Левановіч падаў заяву с просьбай дазволіць яму пачаць чытанне курса

---

* *Протокол № 1 Заседания Совета Этнолого-Лингвистического и Социально-Исторического Отделений Педагогического 1/II-24 г.*

беларускай мовы для студэнтаў беларускай секцыі этнолага-лінгвістычнага аддзялення. Хадайніцтва было задаволена, і для курса прадметная літаратурная камісія выдзеліла 2 лекцыйныя і 2 гадзіны практычных заняткаў на тыдзень. Прадметная камісія у адпаведнасці з нарматыўнымі патрабаваннямі таго часу, прызначыла ўступны даклад прэтэндэнта "Гістарычна вывучэнне беларускай мовы ў славянскай філалогіі", што з'яўлялася неабходным дл атрымання права на чытанне лекцый [2, арк. 15 ада.]. Апе тут узнікае нявырашанае намі пытанне, чаму нагрузка ўжо зацверджана, а даклад меў адбыцца пасля? Ці не спяшалася кіраўніцтва універсітэта хутчэй прыняць выкладчыка на работу без санкцыі Інбелкульта?

Дзеля заслухоўвання В. Воўк-Левановіча 1 лютага 1924 г. сабралася пасяджэнне Рад этнолага-лінгвістычнага і сацыяльна-гістарычнага аддзяленняў педфака, на якi старшынстваваў М. Нікольскі і прысутнічала яшчэ 18 чалавек, у тым ліку прадстаўнікі а студэнтаў. Напачатку выкладчык Я. Лёсік заявіў, што беларуская грамадская думка ў яго асоб не згодна з чытаннем курса прэтэндэнтам, наколькі ён не ведае беларускай мовы, дапуска шмат русіцызмаў, называе Надзеждзіна, Буслаева, Грыма "нашымі" вучонымі – яны не нашы, расійскія вучоныя, няма рускай мовы, "панящце "руская мова" гэта выдумка рускаг імперыялізму, мова ёсць велікаруская, украінская і беларуская" [2, арк. 23].

Выступленнем быў зададзены тон усяму працэсу абмеркавання пачутага даклада. Супраць пазіцыі, занятай Я. Лёсікам, актыўна выступілі прафесары М. Нікольскі, І. Замоцін, выкладчыкі М. Пятуховіч, А. Вазнясенскі. Найбольш эмацыйна "супраць яго (Лёсіка – І. Ш.) шавіністычных заяў" выказаўся выкладчык яўрэйскай мовы М. Вейнгер: "У словах Лёсіка ... надзвычайны нацыяналізм, пераходзячы ў канібалізм ... прадстаўнікі ад студэнтаў не пойдуць з людажэрскім шавінізмам выкладчыка Лёсіка" [2, арк. 23]. У адказе Я. Лёсік выказаў шкадаванне, што прафесары, заяўляючы аб сваёй некампетэнтнасці ў галіне лінгвістыкі, далі станоўчу ацэнку паведамленню В. Воўк-Левановіча, і падкрэсліў яшчэ адзін момант: "Калі ёсць ... пастанова, паводле якой гэты курс павінны чытацца на беларускай мове, то ён і павінны на ёй чытацца ... Калі б прыехаў з Масквы Растаргуеў і пачаў бы чытаць гэты курс на рускай мове, то гэта нічога, але калі запрашаецца беларус, то ён павінны ведаць гэту мову і чытаць толькі на ёй" [2, арк. 24].

Занялі бок Я. Лёсіка прысутныя студэнты – Т. Апацёнак і Плашчынскі. Яны катэгарычна выказаліся супраць прадстаўленай кандыдатуры: "... калі Воўк-Левановіч будзе дапушчаны да чытання лекцый па гісторыі беларускай мовы, то яны наведваць яго лекцыі не будуць, таму што з прыватных размоў паміж сабой яны вынесуць больш ведаў пра беларускую мову, як з лекцый Воўк-Левановіча ..." [2, арк. 25 адв.]. Так, Плашчынскі звярнуў увагу, у прыватнасці, на тое, што дакладчык гаварыў аб гістарычным вывучэнні беларускай мовы не ў славянскай філалогіі, а ў рускім мовазнаўстве [2, арк. 24 адв.]. Дарэчы, ніхто з выступоўцаў не аспрэчыў яго довадаў. Адначасова ролю ІБК у вырашэнні навукова-кадравага пытання прасвятляе заява М. Пятуховіча: "Што тычыцца заявы Лёсіка, што беларуская грамадская думка супраць прызначэння кандыдатуры Воўк-Левановіча, то ... далёка не ўсе члены Інстытута Беларускай Культуры выказваюцца супраць яе ..." [2 арк. 23 адв.]. Даволі нечакана, калі мець на ўвазе як у спрачальнікаў разгарэліся пачуцці, падвёў рысу пад дыскусіяй выкладчык В. Дрышчыц. Абурыўшыся заявамі студэнтаў, ён прапанаваў прызнаць абарону даклада здавальняючай, "апе маючы на ўвазе тое, што ўтварылася сварка, пытанне аб даручэнні В. Левановічу курса адкласці і прадставіць вырашэнне гэтага пытання дэканату". Рашэнне аб прызнанні здавальняючымі даклад і яго абарону было прынятае 8 галасамі пры двух супраць (студэнты Апацёнак і Плашчынскі, прозвішчы ўнесены ў пратакол па іх патрабаванню) [2, арк. 25 адв.].

Паводле матэрыялаў пратакола пасяджэння Рады аддзяленняў педфака магло б скласціся ўражанне, што апаненты Я. Лёсіка кіраваліся матывамі выключна акадэмічнага навуковага характару, калі б не заявы кшталту: "... супярэчыць відам і Савецкай улады і Камуністычнай партыі, якая імкнецца пабудаваць жыццё на поўнай згодзе ўсіх нацыянальнасцяў" (М. Вейнгер), "Лёсік увесь час дапускае нецярпімае стаўленне да рускай мовы, якая аб'ядноўвае і будзе аб'дноўваць працоўных Саюза ССРэспублікі" (В. Воўк-Левановіч) [2, арк. 23 адв., 25]. Думаецца, падобныя меркаванні ў сукупнасці з іншымі, выказанымі на пасяджэнні рускімі (па паходжанні і па свядомасці) і яўрэйскімі спецыялістамі, якія не ўлічылі змены дзяржаўнага курса, абумоўленай рашэннямі X і XII з'ездаў РКП(б) ў галіне нацыянальнай палітыкі, паказваюць іх імкненне супрацьстаяць беларусізацыі універсітэта, а шырэй – навукі і вышэйшай адукацыі ў рэспубліцы.

На гэтым справа, аднак, не была скончана. Праз тыдзень адбылося пасяджэнне дэканату педагагічнага факультэта, пад старшынствам У. Ігнатоўскага і ў прысутнасці А. Вазнясенскага,

У. Пічэты, М. Нікольскага, І. Пятосіна, М. Блюдухі (Бліадухі) і С. Гімельфарба ад студэнтаў. На ім асудзілі паводзіны студэнтаў пры абмеркаванні даклада В. Воўк-Левановіча (асабліва пастараўся С. Гімельфарб). Але не гэта было галоўным. Удзельнікі пасяджэння пастанавілі: "Беручы пад увагу напружаную атмасферу, створаную інцыдэнтам што меў месца, адкласці пачатак чытання лекцый Воўк-Левановічам па гісторыі беларускай мовы да наступлення спрыяльных аб'ектыўных умоў." [2, арк. 29 адв.] Такім чынам, асістэнт В. Воўк-Левановіч быў часова адхілены ад выкладання, а зарплата вызначалася яму ў памеры ставак навуковых супрацоўнікаў – выходзіць, фактычна паніжаны і ў пасадзе. Значыць, "беларуская грамадскасць" увасобленая Інбелкультам, усё ж такі дабілася, каб той, каго яна лічыла русіфікатарам беларускай мовы, не прыступіў да выкладання тэарэтычнага курса ва універсітэце. І толькі праз тры гады – 26 лютага 1927 г. – адбыўся загад Наркамата асветы аб прызначэнні В. Воўк-Левановіча на пасаду дацэнта універсітэта [3, арк, 16]. Працаваў ён па сумяшчэнню і ў Інстытуце беларускай культуры.

Навуковая пазіцыя В. Воўк-Левановіча, наўпрост была заяўлена на абмеркаванні яго паведамлення: "Абвінавачанне мяне ў русіцызмах ... не бянтэжаць мяне, таму што на гэты конт у мяне ёсць сваё навуковае меркаванне, падобна таму, як у маіх апанентаў, якія абвінавачвалі мяне ў няведанні беларускай мовы, ёсць свой погляд на дарэчнасць і неабходнасць у беларускай мове паланізмаў" [2, арк. 25].

Магчыма менавіта гэта прыцягнула да яго ўвагу арганізацыі, якая падавалася б далёкай ад уласна навуковых праблем і дыскусій – ОГПУ. З дапамогай дадзенай установы ці без яе адбыліся кар'ерныя змены ў жыцці даследчыка, мы адназначна сказаць не можам, але ёсць падставы меркаваць, што як мінімум з 1925 г. яго дзейнасць стала прадметам пільнай увагі ОГПУ. Р. Рапапорт інфармаваў сакратара ЦК КП(б)Б К. Гея аб цкаванні Воўк-Левановіча беларускімі нацыяналістамі заходняй арыентацыі з моманту яго прыезду ў Мінск (годам прыезду чамусьці вызначаны 1925), аб выступленні ўсіх нацыянал-дэмакратычных колаў супраць кнігі "Лекцыі па гісторыі беларускай мовы" (1927 г.), дзе ён даў зразумець ім, што "яны скачуць пад дудку Пілсудскага" [4, арк. 43]. Такім чынам, рэзкіх зменаў у пазіцыі навукоўца, прынамсі для службы дзяржбяспекі, на працягу яго працы ў Беларусі ў 1920-х гадах не адбылося. Больш таго, с пункту гледжання сённяшняга дня, можна гаварыць, што той ішоў на повадзе ў ОГПУ. Аб гэтым сведчыць запіска старэйшага ўпаўнаважанага Сікорскага, які ў кастрычніку 1929 г. угаварыў В. Воўк-Левановіча выступіць з дакладам у БелАН: "Вялікадзяржаўныя шавіністычныя ўстаноўкі Воўк-Левановіча, наведванне ім Карскага мне былі вядомыя, але ад папраўак і заўваг я ўстрымаўся. Пасля даклада я пайшоў да Мамчыца (інспектар пачатковых школ НКА – І. Ш.) і абурана казаў яму, як гэта ніхто не рэагуе на выступленне. І група пачынае дзейнічаць ... ад Воўк-Левановіча застаюцца рожкі ды ножкі." [4, арк. 36]. Думаецца, оперупаўнаважаны некалькі перабольшвае сваю ролю. Ад часу першага даклада вучонага прайшло больш за пяць гадоў, якія не толькі сталі плённымі ў развіцці навукі ў Беларусі, у тым ліку мовазнаўства, але і прывялі многіх былых працаўнікоў беларускай справы да прызнання неабходнасці яе развіцця. Таму старая арыентацыя В. Воўк-Левановіча на жывую мову горада, па сутнасці яшчэ небеларускага, як эталона для развіцця літаратурнай мовы, ужо не разглядалася толькі як яго персанальнае навуковае права, а некарэктныя выказванні не дадавалі аўтарытэту

Чаму ж пасля дакладу ў Акадэміі навук 16 снежня 1929 г. на тэму "Пра некаторыя важнейшыя недахопы беларускай літаратуры" ад яго застаюцца "рожкі ды ножкі"? Відавочна, таму што ўсіх нязгодных са сваімі прапановамі абвінавачваў у свядомым імкненні адарваць беларускую мову ад рускай, называў усё кіраўніцтва навуковымі мовазнаўчымі ўстановамі "нацыяналістычным засценкам". Ці не з прычыны падтрымкі і натхнення яго АДПУ праяўлялася такая "смеласць"? Ён, у прыватнасці, прапаноўваў замяніць беларускія словы на рускія: апрэль, фяўраль, аб'яўленне, знамя, случай, срэдства, шчот; пісаць – ідэал, інцярэсы, цеатр і г.д. [5, с. 123] Выглядае на тое, што менавіта пасля гэтага даклада У. Ігнатоўскі прапанаваў В. Воўк-Левановічу пакінуць Беларусь і універсітэт. Звярнуўшы ўвагу на захады прэзідэнта БелАН, згаданы Р. Рапапорт у маі 1930 г. рэзюмаваў: "Ад'езд Воўк-Левановіча з БССР палітычна нявыгадны, таму што з яго ад'ездам распадаецца група беларусаў-усходнікаў, якія вядуць барацьбу з групай заходнікаў і расшыфроўваюць іх контррэвалюцыйную сутнасць" [4, арк. 46].

Такім чынам, асоба В. Воўк-Левановіча патрэбная была менавіта для ініцыіравання рознагалоссяў у беларускім навуковым асяродку, асабліва ва ўмовах нарастаючай барацьбы з гэтак званым нацыянал-дэмакратызмам. Але ў 1930 г. згаданы мовазнаўца працаваў ужо за межамі Беларусі.

**Літаратура**


јиональный архив Республики Беларусь (НАРБ) Ф. 4-п. – Воп. 1. – Спр. 2309. Проекты :тановлений и резолюций пленума, секретариата, коллегии агитационно-пагандистского отдела ЦК КП(б)Б, совещания секретарей совхозных и колхозных ячеек б)Б, протоколы совещаний при агитационно-пропагандистских отделах Гомельского и лцкого окружкомов КП(б)Б, [информации] о партийном просвещении в городе и деревне, зоды и предложения по докладам о социальном воспитании, борьбе с пьянством в БССР э. [1925 г.] – 1 марта 1929 г.

РБ. Ф. 205. – Воп. 1. – Спр. 781. Протоколы заседаний деканата, советов отделений и дметных комиссий [педагогического] факультета. 16 декабря 1923 г. – 26 декабря 1924 г.

РБ. Ф. 42. – Воп. 1. – Спр. 368. Постановления Наркомпроса БССР. 26 февраля 1927 г. – апреля 1928 г.

РБ. Ф. 4-п. – Воп. 1.– Спр. 4720. Докладные записки ГПУ БССР о настроениях национал-юкратических кругов г. Минска, наличии кулацких элементов в отдельных районах БССР, рнялении классовой линии партии при обложении и взыскании сельскохозяйственного юга с кулацких хозяйств, состоянии немецких колоний Мозырского окр. и др. 26 апреля 9 г. – 31 мая 1931 г.

манович, І.К. Беларускія мовазнаўцы: Нарысы жыцця і навуковай дзейнасці / Германовіч. – Мінск: Універсітэцкае, 1985. – 255 с.